# Паэзія для маленькіх дзетак

## ( ад двух да трох гадоў )

У раннім узросце дарослы выразна расказвае вершаваныя радкі дзіцяці і эмацыянальна заахвочвае малога да расказвання гэтых радкоў разам. Некаторыя забаўлянкі, песенькі, вершы беларускіх паэтаў маюць дыялагічную пабудову. Пры чытанні такіх забаўлянак перад вачыма дзіцяці разгортваецца невялікае тэатралізаванае дзейства, у якім малыя разам з дарослым могуць прымаць удзел, выклонваючы асобныя рухі, якія ім паказаў дарослы.

### Сарока-варона ...

Сарока-варона

Ладачкі-ладкі.

-- Дзе былі?

-- У бабкі?

-- Што рабілі?

-- Муку малолі.

-- Дзе падзелі?

-- Мышкі з’елі.

-- Куды панеслі?

-- Сюды, сюды, сюды.

### Мышка, мышка, дзе была? ..

-- Мышка, мышка, дзе была?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-- Была ў пана караля.

-- Што рабіла? – Лыжкі мыла.

-- А што далі? – Кавал сала.

-- Дзе паклала? – Пад лаўкаю.

-- Чым накрыла? – Халяўкаю.

-- Дзе падзела? – Кошка з’ела.

**Валёнкі**

Коця коўзацца хадзіў,

Сабе лапкі застудзіў.

Прыбег да Аленкі:

-- Пазыч мне валёнкі!

Я зімою панашу,

А вясною прынясу!

*Г. Іванова*

**Мышка**

- Мышка, мышка, дзе была?

- Вунь на тым канцы сяла.

- Што ты там рабіла?

- Катоў лавіла,

Усіх загнала ў пасткі...

- А што зарабіла?

- Лычка каўбаскі,

Хлеба акрайчык

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З мезены пальчык.

- Дзе ж тое лычка?

- Схапіла сінічка.

- Дзе ж той акрайчык?

- З’еў малы зайчык.

З’елі хлеб, каўбаску,

Вам прыслалі казку.

*В. Вітка*

## Тэма . Агародніна

**Зносіны па тэме верша Т. Кляшторнай “ Дапамагу”**

*Праграмны змест:* прывучваць дзяцей да слухання паэтычных твораў, актывізаваць іх слоўнік па тэме “ агародніна”, вызваць у выхаванцаў жаданне паўтараць вершаваныя радкі.

*Матэрыял:* морква, цыбуля, памідоры, агуркі, часнок, буракі, рэпа (натуральные рэчы або муляжы); кошык. Малюнкі для кожнага дзіцяці (морква, цыбуля, памідоры, агуркі, часнок, буракі, рэпа)

Ход

- У маёй бабулі есць невялікі агарод. Я ёй дапамагаю яго даглядаць.

- Вось што вырасла ў бабулі на градцы ( морква, цыбуля, памідоры, агуркі, часнок, буракі, рэпа ( вынімае агародніну з кошыка, называе і паказвае науральныя рэчы або муляжы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Мая сяброўка, маленькая дзяўчынка Лізачка, таксама дапамагае сваёй бабулі даглядаць агарод. Паслухайце, як расказваецца пра яе ў вершыку. Вершык называецца “Дапамагу”.

**Дапамагу**

На гародзе ў бабулі

Многа морквы і цыбулі,

Памідораў, агуркоў,

Часнаку і буракоў.

Я на грады пабягу

І бабулі памагу:

Моркву з рэпай прапалю,

А пасля гуркі палью.

*Т. Кляшторная*

*У час расказвання выхавальнік паказвае агароніну.*

- Паслухайце яшчэ раз, пра агародніну, якая расце ў бабулі на агародзе. Я буду расказваць вершык і паказваць агародніну.

*Вершык чытаецца яшчэ раз. Чытанне верша суправаджаецца адначасовым паказваннем агародніны ( натуральнай або муляжоў) педагогам.*

- Давайце разам раскажам і пакажам, якая агародніна вырасла ў бабулі.
- Я буду расказваць верш і паказваць агародніну ( карцінку або муляж), а вы называць яе. ( 2 разы).
- Цяпер будзем расказваць верш і паказваць агародніну разам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Я буду расказваць верш і паказваць агародніну, якая ляжыць у кошыку, а вы таксама будзеце называць агародніну на карцінках і паказваць карцінкі(або натуральныя рэчы ) з адлюстраваннем агародніны ў час расказвання верша.

Расказванне верша выхавальнікам разам з дзецьмі.( 2 разы)

**Зносіны па тэме верша І. Муравейкі “ Ладкі”**

*Праграмны змест:* прывучваць дзяцей да слухання паэтычных твораў, актывізаваць іх слоўнік па тэме “ агародніна”, вызваць у выхаванцаў жаданне суправаджаць чытанне невялікіх паэтычных твораў гульнявымі дзеяннямі.

*Матэрыял:* морква, агуркі, буракі, качаны капусты (натуральные рэчы або муляжы); кошык, зайчык.

Ход

- Паглядзіце, якую салодкую, сакавітую, смачную моркву прынёс нам зайчык з бабулінай градкі.

- Вазьміце кожны па кусочку морквы і паспрабуйце. Яна салодкая, сакавітая, смачная.

- На агародзе ў бабулі вырасла і іншая агародніна: буракі, агуркі, качаны капусты.( паказвае муляж або натуральную агародніну).
- Давайце пакажам, якой велічыні бурак? агурок? качан капусты?
- Станем усе ў карагод, а зайчык стане пасярэдзіне карагода. Будзем хадзіць вакол зайчыка, расказваць пра агародніну і паказваць, якая яна вырасла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Дзеці дапамагаюць выхавальніку расказваць верш І. Муравейкі “ Ладкі”, ідучы ў карагодзе і выконваючы рухі, адпаведныя зместу верша( 2-3 разы).*

**Ладкі**

Ладачкі – ладкі!..
Мы палолі градкі,
Мы палолі самі
Сваімі рукамі

Ад старанай працы
Выраслі на градцы:
Вось такія буракі!
Вось такія агуркі!
А капусты качаны
Вось такой велічыні!

*І. Муравейка*

## Тэма. Птушкі

**Зносіны па тэме верша А. Лойкі “Верабейчык”**

*Праграмны змест:* прывучваць дзяцей да слухання паэтычных твораў, вызваць у іх жаданне суправаджаць расказванне паэтычнага твора педагогам уласнымі гульнявымі дзеяннямі; заахвочваць выхаванцаў да дагаворвання вершаваных радкоў.

*Матэрыял:* верабейчык ( цацка, малюнак).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ход

- Паслухайце, хто гэта там ціўкае за дзвярыма? *( даносіцца ціўканне верабейчыка*)

- Чый гэта галасок? Цікава паглядзець.

- Дзеці, да нас прыляцела маленькая птушачка – верабейчык. Паглядзіце на верабейчыка. *( цацка)*.Пер' е ў яго рабенькае. Сам ён маленькі.

- Верабейчык спявае сваю песеньку: "Чыў-чыў, чыў-чыў".
- Праспявайце песенку верабейчыка: "Чыў-чыў, чыў-чыў".
- Паслухайце вершык, у якім матуля просіць верабейчыка, каб ён громка не спяваў і не будзіў яе дачушкі.

**Верабейчык**

Верабейчык, верабей
Шэранькая птушачка,
Не чырыкай на вярбе,
Не будзі дачушкі.

Спіць яна салодкім сном
На падушцы белай,
І прыціх увесь наш дом,
Быццам анямелы.

Толькі ты адзін у нас
Гэткі несвядомы:
На галінцы ля акна
Ціўкаеш без стомы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ці маленькіх у цябе

Не было ніколі,

Што на сонечнай вярбе

Ты шуміш, сваволіш.

Верабейчык, верабей,

Шэранькая птушка ,

Не чырыкай на вярбе,

Не будзі дачушкі.

*А. Лойка*

- Давайце пакажам верабейчыку, як трэба спяваць песеньку, каб не разбудзіць дачушкі.

- Разам са мной ціхенька праспяваем песеньку верабейчыка: "Чыў-чыў, чыў-чыў".
- Цяпер я папрашу верабейчыка, каб ён не будзіў маленькую дзяўчынку – маміну дачушку.

Верабейчык, верабей,

Шэранькая птушка ,

Не чырыкай на вярбе,

Не будзі дачушкі.

- А Алесік ціха праспявае песеньку верабейчыка, ( *так можна расказаць гэтыя радкі з кожным з дзяцей па-асабку)*.
- Малайцы , дзеткі, верабейчык пачуў вашу просьбу і не будзе больш так гучна спяваць, калі маленькая дзяўчынка спіць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Зносіны па тэме верша К. Лейкі “Верабейчык”**

*Праграмны змест:* працягваць прывучваць дзяцей слухаць паэтычны твор, вызваць у іх жаданне выконваць пэўныя рухі ў час расказвання верша педагогам.

*Матэрыял:* карцінка вераб’я.

Ход

- Давайце разам паглядзім ў вакно. Бачыце маленькую, рабенькую птушачку. Гэта верабейчык.

- Паглядзіце, як ён скача, як ён пералятае з месца на месца. Яму холадна: на двары снег, моцны мароз.

- Вось верабейчык і скача, каб яму не замерзнуць.

- Паслухайце, як пра гэта расказваецца ў вершы.

**Верабейчык**

Верабейчык скача, скача,
Яму холадна, няйначай,
Бо мароз трашчыць,
Бо сняжок блішчыць.

*К. Лейка*

- Я буду расказваць верш, а вы паспрабуйце скакаць на адной ножцы як верабейчык

Верш расказваецца 3-4 разы.

## Тэма. Прадукты харчавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Зносіны па тэме верша В. Іпатавай “Аладкі”**

*Праграмны змест:* працягваць прывучваць дзяцей да слухання паэтычных твораў, вызваць у іх жаданне суправаджаць чытанне паэтычнага твора гульнявымі дзеяннямі; заахвочваць выхаванцаў да выразнага дагаворвання вершаваных радкоў напамяць .

*Матэрыял***:** цацкі: коцік, лялька.

Ход

- Да нас у госці прыйшлі лялька Каця і яе маленькае кацяня.
- Каця вельмі любіць сваё кацяня. Яна корміць яго, гуляе з ім.
- Аднойчы яна нават напякла яму аладак з пяску. Паслухайце вершык, як лялька Каця пякла для свайго коціка аладкі.

**Аладкі**

Я аладачкі з пяску

Сёння цэлый дзень пяку,

Але мой рахманы кот

Не бярэ аладкі ў рот.

-- Коцік, коцік, не ўцякай!

Чаго хочаш?

-- Ма-ла-ка!

*В. Іпатава*

- Пакажыце, як дзяўчынка пячэ аладкі з пяску, а я ў гэты час буду расказваць верш.( верш расказваецца 1 раз)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Каб аладкі атрымаліся смачныя, трэба мука, яйка, цукар, масла, смятанка. Лялька пячэ аладкі з пяску. Вось таму іх коцік і не есь.
- Давайце разам папросім коціка, каб ён не ўцякаў і запытаемся , што ён хоча з'есці замест аладак з пяску.

Коцік, коцік, не ўцякай!

Чаго хочаш?

*(дзеці, звяртаючыся да цацкі коціка спачатку паўтараюць верш за выхавальнікам, а потым заве кожны індывідуальна, замест коціка адказвае выхавальнік).*

## Тэма. Мая сям'я

**Зносіны па тэме верша верша В. Віткі « Бабіны госці»**

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне разумець змест вершаваных тэкстаў. Вызваць у выхаванцаў жаданне інтанацыйна выразна дагаворваць вершаваныя радкі .

*Матэрыял***:** тэкст верша.

Ход

- Маю бабулю завуць Ніна Іванаўна. Я люблю хадзіць да яе ў госці. Яна заўсёды мяне частуе, расказвае казкі, глядзіць разам са мной мульцікі.

- Як завуць вашу бабулю?

- Чым яна вас частуе, калі вы прыходзіце да яе ў госці.

- Паслухайце верш пра тое, як дзеткі хадзілі да бабулі ў госці.

**Бабіны госці**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ладачкі –ладкі!

Дзе былі? – У бабкі.

Што пілі вы?—Малако.

А што елі?—Ко-ко-ко,

Доўга ж вы сядзелі,

Доўга пілі-елі.

А мы не сядзелі –

Цэлы дзень дурэлі.

Мы і заўтра пойдзем

Да бабулі нашай –

Абяцала бабка

Бярозавай кашы.

*В. Вітка*

- Давайце разам з вамі раскажам пра тое, як дзеці гасцілі ў сваёй бабулі?

- Вы будзеце рабіць "ладачкі-ладкі"( пляскаць у далонькі) і дапамагаць мне расказваць верш.

Ладачкі –ладкі!

Дзе былі?... – *У бабкі. ( дагаворваюць дзеці)*

Што пілі вы?.. – *Малако. ( дагаворваюць дзеці)*

А што елі?... – *Ко-ко-ко, ( дагаворваюць дзеці)*

Доўга ж вы сядзелі,

Доўга пілі-елі…

А мы не сядзелі –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Цэлы дзень дурэлі.

Мы і заўтра пойдзем

Да …*бабулі нашай – ( дагаворваюць дзеці)*

Абяцала бабка

Бярозавай кашы.

- Давайце раскажам яшчэ раз. Цяпер я буду расказваць з Алесікам. *(так можна расказваць, пакуль ёсць дзеці, якія жадаюць разам з выхавальнікам расказваць верш))*

- Ці спрабаваў хто-небудзь з вас бярозавую кашу?

На самой справе бярозавай кашы не існуе. Пра тое, што дадуць пачаставаць бярозавай кашы, гавораць, калі дзеці дурэюць і не слухаюцца дарослых. Паспрабаваць бярозавай кашы – гэта паспрабаваць, як б'ецца бярозавая галінка.

## Тэма. Посуд

### Зносіны па тэме вершаТ. Кляшторнай "Гаспадыня"

*Праграмны змест*: актывізаваць слоўнік дзяцей па тэме " Посуд", развіваць у іх уменне эмацыянальна ўспрымаць вершы, разумець вершаваны тэкст. Вызваць у выхаванцаў жаданне называць посуд, адлюстраваны на малюнках..

*Матэрыял:* цацачны чайны посуд, карцінкі з адлюстраваннем посуду, цацка Мішка, сурветка.

Ход

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Паглядзіце, хто гэта да нас прыляцеў у госці на паветраным шарыку

- Так, да нас у госці прыйшоў Вінні-Пух.

- Добры дзень, Вінні –Пух! Праходзь да нас у госці. Давайце, дзеткі, пачастуем Вінні-Пуха пірагом з гарбатай. Спачатку разам падрыхтуемся да частавання. Я накрыю стол сурветкай.

- Калі ласка, Танечка, прынясі кубачкі.
- А ты, Марынка, сподачкі.
- Міша прынясе лыжачкі.
- Адась – талерку, каб пакласці пірог.
- Я разалью гарбату ў кубачкі.
- Давайце запросім Вінні - Пуха да частавання.
- Смачна есці, табе, Вінні-Пух!

- А зараз паслухайце вершык, пра тое як гаспадыня частавала Мішку пірагом з гарбатай і што яна рабіла пасля частавання.

**Гаспадыня**

Пірагом з гарбатай

Мішку частавала,

Сподачкі і шклянкі

Са стала прыбрала,

Вымыла талерку,

Кубачак і лыжку

І закалыхала

Зморанага Мішку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Т. Кляшторная.*

- Пачаставала гаспадыня Мішку пірагом з гарбатай, а потым …?

- Што яна зрабіла потым?

- Раскажам разам, што рабіла гаспадыня пасля частавання Мішкі пірагом з гарбатай. - Я буду расказваць і паказваць малюнкі, а ( *імя дзіцяці*) будзе называць, што на іх адлюстравана.*( Выхавальнік у час расказвання паказвае дзецям карцінкі з выявай посуду, пра які гаворыцца ў вершы)*

Вымыла ... *талерку,*

*Кубачак і ... лыжку*

І закалыхала

Зморанага ... *Мішку.*

- Хто яшчэ хоча расказаць пра гаспадыню? ( верш расказваецца пакуль ёсць жадаючыя).
- Цяпер мы прыбяром са стала.
- Калі ласка, Марынка, прынясі кубачкі.
- А ты, Адась, сподачкі.
- Танечка прынясе лыжачкі.
- Міша – талерку. А я здыму сурветку. Вось якія мы з вамі малайцы.
- А зморанага Мішку пакладзем спаць у ложак.

## Тэма. Цацкі

### Зносіны па тэме верша М. Чарняўскага “Конік”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праграмны змест*: развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту. Пабуджаць іх выражаць свае ўяўленні з дапамогай гульнявых дзеянняў.

*Матэрыял*: цацка конік

Ход

- Сёння да нас ў дзіцячы садок прыйшла пасылка. Гэтая пасылка з магазіна цацак. Давайце разам паглядзім, што ў гэтай пасылцы?

- Гэта конік. У яго прыгожая доўгая грыва, хвост. На нагах у коніка капыткі.

- Такога ж коніка купілі ў магазіне цацак маленькаму хлопчыку. Паслухайце , як расказваецца пра гэтага коніка ў вершы.

**Конік**

Мне прывезлі коніка,
Коніка-куплёніка,
З цёмнай грывай стрыгунка,
З цёмнай грывай скакунка.
Мяне конік панясе
Па мураўцы, па расе.
Капыткамі загрукоча,
Ручаінку пераскоча,
Паімчыць, нібы віхор,
За лужок, за сіні бор.

*М. Чарняўскі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Паслухайце яшчэ раз як хлопчык расказвае пра коніка, якога яму купілі ў магазіне.

Мне прывезлі  коніка,

Коніка-куплёніка,

З цёмнай грывай  стрыгунка,

З цёмнай грывай скакунка.

*У час расказвання выхавальнік суправаджае чытанне паказам.*

- Хлопчык любіць гуляць са сваім конікам-куплёнікам.

- Пакажыце, як вы ўмеце скакаць на коніку. Малайцы, усе умеюць скакаць на коніках.

- А зараз *( імя дзіцяці*) паскача на коніку, а я прачытаю вершык.

***Глеба*** конік панясе

Па мураўцы, па расе.

Капыткамі загрукоча,

Ручаінку пераскоча,

Паімчыць, нібы віхор,

За лужок, за сіні бор.

- Хто яшчэ хоча пакатацца на коніку, а я пра гэта вершык прачытаю.

**Зносіны па  тэме верша Е. Лось “Мая лялька”**

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш,  разумець змест вершаванага тэксту. Вызваць у выхаванцаў жаданне суправаджаць чытанне невялікіх паэтычных твораў гульнявымі рухамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Матэрыял:* лялька.

Ход

- Вось лялька Таня. Яна прыгожая, у яе светлыя валасы і прыгожы жоўты бант. Сукенка ў лялькі чырвоная ў жоўты гарошак, фартушок белы , шкарпеткі жоўтыя , а туфлі таксама чырвоныя.

- Паслухайце вершык, у якім дзяўчынка расказвае, як яна гуляе са сваёй лялькай.

**Мая лялька**

Ляльцы хочацца катлеткі –
Я катлетку ёй даю.

І зімою, і ўлетку
Чаем я яе паю.
Чышчу лялцы чаравікі,
Мыю белы фартушок,
Бант завязваю вялікі,
Што як жоўты матылёк.
Я вучу яе смяяцца,
Маляваць і размаўляць,
З мамай раніцай вітацца,
З кошкай Муркай сябраваць.

*Е. Лось*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-Давайце разам раскажам, як дзяўчынка гуляе з лялькай. Я буду верш расказваць, а

*( імя дзіцяці*) паказваць, дзе ў лялькі чаравікі, белы фартушок і бант вялікі нібы жоўты матылёк.*( Верш расказваецца некалькі разоў, пакуль ёсць жадаючыя дзеці расказваць верш разам з педагогам*).

**Зносіны па тэме верша І. Муравейкі "Лялька гуляць пайшла"**

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту. Вызваць у дзяцей жаданне запомніць і выразна расказваць радкі з верша напамяць . Выхоўваць клапатлівыя адносіны да роднай матулі.

*Матэрыял***:** лялька Таня.

Ход

- Гэта лялька Таня дзяўчынкі Люсі. Люся любіць гуляць са сваёй лялькай.
- Яна яе корміць, кладзе спаць, гуляе з ёй на вуліцы.
- Але, вось аднойчы...

**Лялька гуляць пайшла**

Згубіла ляльку Люся,

Шукала – не знайшла,

Але не плача Люся:

- Ты, мама, не хвалюйся –

Яна гуляць пайшла.

*І. Муравейка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-Дзяўчынка згубіла ляльку, але яна не плача і супакойвае сваю маму. Давайце разам з дзяўчынкай супакоім яе матулю.

Ты, мама, не хвалюйся –

Яна гуляць пайшла.

- А цяпер я раскажу як Люся гуляла з лялькай, а *(імя дзіцяці*) скажа словы дзяўчынкі Люсі, каб мама не хвалявалася. *(Верш расказваецца некалькі разоў, пакуль ёсць жадаючыя дзеці расказваць верш разам з педагогам*).

**Зносіны па тэме верша “ Калыханка”**

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту. Пабуджаць выхаванцаў да пяшчотнага дагаворвання асобных радкоў калыханкі.

*Матэрыял:* цацка мішка.

Ход

- Што за грукат там за дзвярыма. Гэта да нас у госці ізноў прыйшоў мішка. Памятаеце , як ён прылятаў да нас на паветраным шарыку і мы частавалі яго гарбатай.. Паслухайце яшчэ раз вершык, пра тое як гаспадыня частавала Мішку пірагом з гарбатай.

**Гаспадыня**

Пірагом з гарбатай

Мішку частавала,

Сподачкі і шклянкі

Са стала прыбрала,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вымыла талерку,

Кубачак і лыжку

І закалыхала

Зморанага Мішку.

*Т. Кляшторная.*

- Гаспадыня частавала Мішку пірагом з гарбатай, а потым , калі ён змарыўся, стала яго калыхаць. Яна заспявала яму прыгожую пяшчотную песеньку – калыханку. Паслухайце яе.

**Калыханка**

Закрываюць кветкі вочы,

Толькі Мішка спаць не хоча.

Ён забраўся пад канапу

І ляжыць, узняўшы лапы.

Сам устаць ніяк не можа.

Я паклала Мішку ў ложак.

Спі, мой Мішка, баю-бай,

На мяне не пазірай,

Куры, гусі ўжо заснулі .

Кліча спаць мяне матуля.

Спі, мой любы, люлі, люлі, люлі.

*Н. Галіноўская*

- Паслухайце яшчэ раз калыханку, якую спявала дзяўчынка мішку.

Спі, мой Мішка,  баю-бай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На мяне не пазірай,

Куры, гусі ўжо заснулі .

Кліча спаць мяне матуля.

Спі, мой любы, люлі, люлі, люлі.

- Давайце разам з вамі праспяваем Мішку: “Спі, мой любы, люлі, люлі, люлі”.

-Я пачынаю спяваць калыханку, а ( імя дзіцяці) закончыць: “Спі, мой любы, люлі, люлі, люлі”. Вазьмі ў рукі Мішку, будзем разам спяваць калыханку.

Спі, мой Мішка, баю-бай,

На мяне не пазірай,

Куры, гусі ўжо заснулі .

Кліча спаць мяне матуля.*( А цяпер, калі ласка, запрасі Мішку спаць ты!)*

Спі, мой любы, люлі, люлі, люлі.*( дагаворвае дзіця)*

*( Верш расказваецца некалькі разоў, пакуль ёсць жадаючыя дзеці расказваць верш разам з педагогам*).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма. Дзіцячы сад

**Зносіны па тэме верша К. Буйло “ Дзіцячы сад»**

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту. Вызваць у выхаванцаў жаданне дагаворваць вершаваныя радкі.

Ход

- Вы ўсе ходзіце ў дзіцячы сад. Хто цябе сёння прывёў ў дзіцячы садок Максімка? А цябе – Кацярынка? А цябе – Даніла ?

- Паслухайце, як пра гэта расказваецца ў вершы.

**Дзіцячы сад**

Нас у сад дзіцячы

Водзяць мамы. Мы не плачам.

Я дык нават вельмі рад,

Што іду ў дзіцячы сад.

*К. Буйло*

- Давайце раскажам гэты вершык разам. Я пачынаю, а (імя дзяцяці) заканчвае.

Нас у сад дзіцячы

Водзяць ... *мамы*. Мы не ... *плачам.*

Я дык нават вельмі ... *рад,*

Што іду ў дзіцячы ... *сад.*

( *Верш расказваецца некалькі разоў, пакуль ёсць жадаючыя дзеці расказваць верш разам з педагогам*).

## Тэма. Мой дзень.

### Зносіны па тэме верша І. Муравейкі "Я сама"

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, звязваць яго з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэальнымі карцінамі з уласнага жыцця . Вызваць у іх жаданне драматызаваць радкі з верша.

*Матэрыял:* тэкст верша, малюнкі ( маленькая дзяўчынка, дзяўчынка апранаецца, дзяўчынка ўмываецца, дзяўчынка прычосваецца).

Ход

- Ці ўмееце вы самі апранацца?

- Паглядзіце на гэтую дзяўчынку.

- Танечка ўсё любіць рабіць сама. Яна сапраўдная ўмеліца, хаця яшчэ і вельмі маленькая. Калі мама хоча дапамагчы дзяўчынцы, то яна ёй адказвае : “ Я сама”.

- Паслухайце верш пра гэтую дзяўчынку.

**Я сама**

- Хадзі, будзем апранацца...
- Я сама! Я сама!
- Хадзі, будзем умывацца...
- Я сам! Я сама!
- Дык хадзі хоць прычашу я ...
- Я сама! Я сама!
Вось умеліца якая
Наша Танечка малая!

*І. Муравейка*

- Давайце раскажам вершык разам, я буду матуляй , а хто-небудзь з вас маленькім хлопчыкам або дзяўчынкай.. Я буду вас прасіць выконваць розныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзеянні, як прасіла ў вершыку маці дзяўчынку, а вы будзеце адказваць так, як Танечка адказвала сваёй матулі: “Я сама, я сама”.

- Хадзі, будзем апранацца...

- Я сама! Я сама!

- Хадзі, будзем умывацца...

- Я сам! Я сама!

- Дык хадзі хоць прычашу я ...

- Я сама! Я сама!

Вось умеліца *( умелец які)* якая

Наша Танечка*( наш Дзімачка малы*) малая!

*І. Муравейка*

*( Верш расказваецца некалькі разоў, пакуль ёсць жадаючыя дзеці расказваць верш разам з педагогам. Выхавальнік расказвае верш з ужываннем уласнага імя дзіцяці*).

## Тэма. Зіма

### Зносіны па тэме верша А. Дзеружынскага “Сані”

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту. Пабуджаць выхаванцаў да ўключэння ў змест вершаваных радкоў свайго імя .

*Матэрыял***:**карцінка “ Зімовыя забавы”

Ход

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- На двары холадна. Зіма. Мамы і таты возяць малых дзетак па снегу на санаачках, катаюць іх з горкі. Паслухайце верш пра саначкі.

**Сані**

- Хто вас гоніць
З горкі,сані?
- Ды ніхто,
Бяжым мы самі.
- А чаго вам
Так спяшацца?
- Трэба ж Яначку
Катацца.

*А. Дзеружынскі*

- Давайце раскажам гэты вершык разам. Я буду расказваць, а вы падкажаце санкам сваё імя, каб яны ведалі каму на іх катацца.

- Хто вас гоніць
З горкі,сані?
- Ды ніхто,
Бяжым мы самі.
- А чаго вам
Так спяшацца?
- Трэба ж ... *( назаві сваё імя)*
Катацца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Верш расказваецца пакуль ёсць жадаючыя расказваць гэты верш разам з педагогам і называць сваё імя.*

**Зносіны па тэме верша "Сняжынкі"**

*Праграмны змест*: развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, суадносіць карціны прыроды ў вершаваным тэксце і ў рэальным жыцці. Пабуджаць выхаванцаў да выканання пэўных рухаў у час расказвання верша педагогам.

*Матэрыял:* назіранне за снегападам.

Ход

- Пaглядзіце ў вакно.Зіма. Холадна. Ідзе снег. Падаюць сняжынкі. Многа, многа іх кружыцца ў паветры. Паслухайце, як расказваецца пра сняжынкі ў вершы.

**Сняжынкі**

Закружыліся
Сняжынкі
Нізка-нізка
Над зямлёй.

Ціха лётаюць
Пушынкі
Незлічонай
Чарадой.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Быццам тыя

Матылёчкі,

Весяляцца

Нездарма –

Адамкнула

Усе замочкі

У небе ім

Сама зіма.

*А. Дзеружынскі*

- Пакажыце, як закружыліся сняжынкі нізка-нізка над зямлёй. Пакружыцеся, як сняжыначкі.

- Педагог суправаджае рухі дзяцей чытаннем урыўка з верша.

Закружыліся

Сняжынкі

Нізка-нізка

Над зямлёй.

Ціха лётаюць

Пушынкі

Незлічонай

Чарадой.

Верш расказваецца 3-4 разы.

**Зносіны па тэме верша “ Адмарозіў лапкі”**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праграмны змест*: развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, імітаваць і перадаваць голасам асобныя словы з вершаваных радкоў .

*Матэрыял*: цацка коцік

Ход

- Паслухайце, хто гэта голас падае.Так, гэта коцік. Давайце разам пашукаем коціка. Вось ён куды схаваўся *( дастае коціка з цацачнага ложка).*
- Накрыўся зверху коўдрай, мы нават адразу яго і не заўважылі.
- Холадна коціку. Што такое здарылася? Чаго яму так холадна?

**Адмарозіў лапкі**

Коцік басаногі
Па сняжку гуляў.
Адмарозіў лапы
І заплакаў: -- Мяў...
Што за дзіва гэта?
Трэба бегчы ў дом:
Снег такі халодны,
А пячэ агнём...

*І. Муравейка*

- Давайце раскажам верш разам. Я буду расказваць верш, а ( імя дзіцяці) пакажа голасам, як коцік заплакаў.

Коцік басаногі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Па сняжку гуляў.

Адмарозіў лапы

І заплакаў: **-- Мяў**

Што за дзіва гэта?

Трэба бегчы ў дом:

Снег такі  халодны,

А пячэ  агнём...

*Такім чынам верш расказваецца пакуль ёсць жадаючыя імітаваць як падае голас коцік.*

**Зносіны па  тэме верша  "Сняжок"**

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш,  разумець змест вершаванага тэксту.  Вызваць у выхаванцаў жаданне  выразна дагаворваць асобныя вершаваныя радкі напамяць, самастойна ўстаўляць уласнае імя ў змест верша ў час расказвання яго выхавальнікам .

*Матэрыял:*малюнак " Дзяўчынка з хлопчыкам узімку".

Ход

- Ці ішоў сёння снег, калі вы ішлі ў дзіцячы садок?
- Так, сняжынкі падалі на зямлю, на дрэвы, на дахі дамоў, на саміх маленькіх дзетак, на іх бацькоў.
- Паслухайце вершык пра дзяўчынку і сняжынкі.

**Сняжок**

Закружыліся сняжынкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ну, нібыта матылькі.

Надзя – жвавая дзяўчынка –

Ловіць іх у дзве рукі.

А ў самой сняжок

На вейках,

На плячах,

На каўнеры –

Нібы гэта не Надзейка,

А снягурка на двары.

*І. Шуцько*

- Хто з вас лавіў снег у дзве рукі, як і Надзейка, калі вы ўранку ішлі ў дзіцячы садок?

- Паслухайце вершык яшчэ раз.

- Раскажыце, у каго з вас, як і ў дзяўчынкі з вершыка, быў сняжок на вейках, на плячах, на каўнеры .

- На каго вы былі падобныя , у такім прыгожым адзенні белага колеру?

- Давайце яшчэ раз раскажам пра тое, як выглядала Надзя-жвавая дзяўчынка, калі закружыліся сняжынкі, ну нібыта матылькі?

Закружыліся сняжынкі,

Ну, нібыта матылькі.

Надзя – жвавая дзяўчынка –

Ловіць іх у дзве рукі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А ў самой сняжок

На ... *вейках,*

На ... *плячах,*

На ... *каўнеры –*

Нібы гэта не Надзейка,

А ... *снягурка на двары.*

*У час расказвання педагог трымае ў руках малюнак з выявай дзяўчынкі і паказвае вейкі, плечы, каўнер. Расказваюць 2-3 разы.*

- Цяпер раскажам гэты верш пра якую-небудзь з нашых дзяўчынак. Я буду раказваць верш, а дзяўчынкі з нашай групы называць сваё імя, быццам бы гэты верш пра іх.

*Верш расказваецца пакуль ёсць жадаючыя расказваць гэты верш разам з педагогам і называць сваё імя.*

## Тэма . Жывёлы

### Зносіны па тэме верша С. Сокалава-Воюша "Мышаня"

*Праграмны змест***:** працягваць развіваць у дзяцей уменне разумець змест вершаванага тэксту. Вызваць у выхаванцаў жаданне інтанацыйна выразна пачынаць расказваць вершык разам з выхавальнікам.

*Матэрыял***:** малюнкі : кошка, мышка.

Ход

- Давайце пагуляем у "Кошкі-мышкі".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Вы –  мышкі, а я – кошка.
- Мышкі ўцякаюць ад кошкі, а кошка ловіць мышак.
- Адна мышка, другая, трэцяя – вось колькі мышак злавіла кошка.
- Паглядзіце на мышку?(цацка або малюнак)
- Яна шэранькая, маленькая, з доўгім хвастом.
- Мышка любіць паласавацца сырам, а кошка любіць паласавацца мышкай.
- Маленькае дзіцяня  мышкі завуць мышаня ( цацка або малюнак).
- Мышка заве сваё мышаня: "Пі-пі-пі"
- А мышаня адказвае тоненькім галаскам: " Пі-пі-пі".
- Пакажыце, як  падае голас мышка.
- Паклічце маму –мышку тоненькім галаскам, як мышаня.
- Паслухайце  вершык пра маленькае мышаня.

**Мышаня**

Раз-два-тры, раз-два-тры,
Мышаня глядзіць з гары,
Хоча сыру, слёзы лье,
Але коцік не дае.

*С. Сокалаў-Воюш.*

- Раскажам цяпер гэты вершык разам. Вы раказваеце першы радок верша, а я – астатнія.

( Імя дзіцяці) пачынае.

*Раз-два-тры,* ... *раз-два-тры,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мышаня глядзіць з гары,

Хоча сыру,  слёзы  лье,

Але коцік не  дае.

- А цяпер раскажам гэты вершык з ( імя дзіцяці).

*Вершык раказваецца пакуль ёсць жадаючыя.*

**Зносіны па  тэме верша С. Сокалава -Воюша  "Авечка"**

*Праграмны змест*: працягваць развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш. Вызваць у выхаванцаў жаданне інтанацыйна выразна паўтараць напамяць асобныя радкі з верша ў загадным ладзе.

*Матэрыял:* малюнкі " Авечка", " "Чарада авечак пасвіцца на ўзгорку".

Ход

- Паглядзіце на малюнак, гэта авечка.
- " Ме-Ме-Ме"! Авечка  так голас падае?
- Яна белая, кучаравая,  любіць есці зялёную траўку і піць чыстую, празрыстую вадзічку.
- Як авечка голас падае? Правільна, " Ме-Ме-Ме"!
- Паслухайце вершык пра авечку.

**Авечка**

Мы вядзем паіць на рэчку

Кучаравую авечку.

Пі, авечачка, ваду

І вяртайся ў чараду.

*С. Сокалаў-Воюш*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Чарада, гэта калі некалькі авечак разам.

- Паглядзіце на гэты малюнак. Вось там на ўзгорку пасецца чарада авечак.

- Паўтарыце ласкава тыя радкі, дзе дзеткі запрашаюць авечку піць ваду: “***Пі, авечачка, ваду”***

- Раскажам вершык разам. Я раскажу, як мы вядзем паіць на рэчку кучаравую авечку, а хто-небудзь з вас запросіць яе папіць ваду.

Мы вядзем паіць на рэчку

Кучаравую  авечку...

*Пі, авечачка,  ваду( запрасіць прагаворваць гэтыя радкі каго-небудзь з дзяцей)*

І вяртайся ў чараду.

*Вершык расказваецца пакуль у дзяцей ёсць жаданнезапрасіць авечку папіць вады.*

**Зносіны па  тэме верша І. Шуцько “Яечка”**

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш,  разумець змест вершаванага тэксту. Вызваць у выхаванцаў жаданне імітаваць галасы птушак і жывёл,  правільна перадаваць гукапераймальныя словы з верша.

*Матэрыял***:** малюнкі : курачка, карова, індык, авечка, гусак.

Ход

- Паглядзіце на гэтыя малюнкі. Гэта курачка, карова, індык, авечка, гусак .

- Паслухайце верш пра яечка і курачку, якая яго знесла, ды іншых свойскіх жывёл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Яечка**

--Куд-кудак!.. Куд-кудак!

Яйка знесла я з кулак, --

Узняла чубатка крык.

--Так,так, так!..—сказаў індык.

І карова кажа:

-- М-му!

А каму?

І авечка,

Як пачула пра яечка,

Забляяла:

--Ме-ме-ме!

Можа, мне?

Гусак крыкнуў:

-- Ого-го!

Захацела ты чаго!

Тут якраз прыйшла Марынка,

Невялічкая дзяўчынка:

-- Яйка курачка знясла!

І сабе яго ўзяла.

*І. Шуцько*

- Давайце пагуляем, раскажам як жывёлы падаюць у вершыку голас.*( паказаць малюнкі)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Курачка – ...куд- кудак
- Індык –  ... так-так-так
- Карова – ...му-му-му
- Авечка – ...ме-ме
- Гусак – ...Ого-го

- Раскажам гэты  верш разам. Я яго буду расказваць, а вы будзеце мне дапамагаць, падказваючы, хто з жывёл , як голас падаваў, калі яны пачулі пра яечка. *( Перад тым, як дзіця будзе імітаваць голас жывёлы, трэба паказаць яму карцінку з выявай гэтай жывёлы)*.

--Куд-кудак! Куд-кудак!

Яйка знесла я з кулак, --

Узняла чубатка крык.

--Так, так, так!— сказаў індык.

І карова кажа:

-- ***М-му!***

А каму?

І авечка,

Як пачула пра яечка,

Забляяла:

--***Ме-ме-ме!***

Можа, мне?

Гусак крыкнуў:

**-- *Ого-го!***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Захацела ты чаго!

Тут якраз прыйшла Марынка,

Невялічкая дзяўчынка:

-- Яйка курачка знясла!

І сабе яго ўзяла.

Расказаць верш 2-3 разы.

**Зносіны па тэме верша Н. Галіноўскай "Коцік-варкоцік"**

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту. Вызваць у выхаванцаў жаданне суправаджаць расказванне верша пэўнымі рухамі ў адпаведнасці з яго зместам.

*Матэрыял*:малюнак і цацка" Коцік".

Ход

- Гэта коцік ( цацка або карцінка)
- Як коцік голас падае? ( *" Мяў-мяў, а яшчэ можна пачуць " Мур-мур")*
- Коцік шэранькі, маленькі, з доўгімі вусамі і пушыстым хвастом.
- Ляжыць і песеньку спявае: " Мяў- Мяў", "Мур-мур".
- Заспяваем песеньку разам з коцікам: " мяў, мяў, мяў".
- А цяпер " мур-мур-мур".

- Паслухайце вершык пра коціка.

**Коцік-варкоцік**

Коцік-варкоцік

Лёг на жывоцік,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лапкі пад вушка –

Не трэба падушка.

*Н. Галіноўскай*

- Коціка ў вершы завуць коцік— ( *дагаворвайце)* варкоцік.

- Давайце разам раскажам вершык. Я буду расказваць словамі, а вы пакажыце рухамі тое, што робіць коцік.

Вось малайцы, сапраўдныя коцікі-варкоцікі.

Расказваецца 2-3 разы.

**Зносіны па тэме верша В. Віткі “Коця і Каця”**

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту. Выхоўваць ашчадныя адносіны да пакрыўджанага коціка.

*Матэрыял***:** цацка коцік, малюнак : дзяўчынка.

Ход

- Паглядзіце, хто гэта выглядае з хаткі?
- Так, гэта коцік-варкоцік.
- Коцікі любяць піць малачко і злізваць смятанку.
- А гэта хто? *( паказвае малюнак)*.
- Дзяўчынка Каця.
- Маленькія дзеткі таксама любяць саладзенькае каровіна малачко і смятанку?
- І Каця любіць салодзенькае малачко і смятанку.
- Паслухайце вершык пра коціка і дзяўчынку Кацю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Коця і Каця**

Плача коця на кухні,

Ад слёз вочкі папухлі,

Што з табою, мой каток,

Забалеў мо жываток?

Мяў! – сказаў варкоцік, --

Не баліць жывоцік.

У мяне душа баліць –

Як цяпер на свеце жыць.

Як мне жыць у хаце,

Калі хлусіць Каця:

Смятану злізала –

На мяне сказала.

*В. Вітка*

- Пашкадуйце коціка. Пагладзьце яго. Скажыце яму : " Не плач". " Каця больш так рабіць не будзе".

Педагог дае магчымасць кожнаму дзіцяці пашкадаваць коціка.

## Тэма. Звяры ў лесе

**Зносіны па тэме верша А. Якімовіча "Мядзведзь"**

*Праграмны змест*: развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, адчуваць рытм

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вершаваных радкоў. Вызваць у выхаванцаў жаданне выразна дагаворваць словы з верша напамяць.

*Матэрыял:* цацка мядзведзь.

Ход

- Хто гэта стукае да нас ў дзверы. Паглядзіце, гэта – ... мядзведзь. Мядзведзь вялікі, тоўсты, непаваротлівы, касалапы. Ён жыве ў лесе, у яго цёплае футра, карычневага колеру.
- Паслухайце, як расказваецца ў вершыку пра мядзведзя.

**Мядзведзь**

Звер вядомы ён усім –

І старым, і дзецям:

Футра цёплае на ім,

А завуць ... мядзведзем.

*А. Якімовіч*

- Хто з вас хоча разам са мной расказаць пра мядзведзя?

- (Імя дзіцяці) давай разам з табой раскажам пра мядзведзя.

Звер вядомы ён усім –

І старым, і дзецям:

Футра цёплае на ім,

А завуць... закончы радок, назаві, як завуць звера?— *мядзведзем.*

*Вершык расказваецца з усімі дзеткамі, якія пажадаюць яго расказаць.*

**Зносіны па тэме верша А . Якімовіча “Ліска”**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Вызваць у выхаванцаў жаданне інтанацыйна выразна дагаворваць словы ў вершаваных радках напамяць.

*Матэрыял:* цацка ліса, ілюстрацыі: ліса, заяц .

Ход

- Гэта ліса *( паказвае цацку)*. Яна рыжая, у яе маленькія вострыя вушкі і доўгі пушысты хвост. Жыве ліска ў лесе.Паслухайце вершык пра лісічку.

**Ліска**

Навастрыла вушы ліска,( прыслухалася)

Пачала ўглядацца:

Ці няма спажывы ( ежы) блізка –

Птушкі або зайца?

*А. Якімовіч*

- Раскажам вершык разам.Хто з вас жадае?

- (Імя дзіцяці) дапамажы мне расказаць пра ліску.

Навастрыла вушы *...( паказвае ілюстрацыю) ліска,*

Пачала ўглядацца:

Ці няма спажывы блізка –

Птушкі або *...( паказвае ілюстрацыю* ) *зайца?*

*Вершык расказваецца з усімі дзеткамі, якія пажадаюць яго расказаць.*

**Зносіны па тэме верша В. Іпатавай “Вавёрка”**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праграмны змест*: працягваць развіваць у дзяцей уменне разумець змест вершаванага тэксту. Вызваць у выхаванцаў жаданне выконваць рухі ў адпаведнасці са зместам верша. .

*Матэрыял:* малюнак вавёрка

Ход

- Вось гэта вавёрка. Яна жыве ў лесе. У яе прыгожы пушысты хвосцік і вушкі з кутасікамі. Вавёрка любіць скакаць з галінкі на галінку. Пакажыце, як скача вавёрачка.

- Паслухайце вершык пра вавёрку.

**Вавёрка**

Скок вавёрка па сасне –

Паляцеў з галінак снег.

Пад сасною Зайка спаў –

Ён адразу белы стаў.

*В. Іпатава*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Давайце разам раскажам пра вавёрку. Я буду расказваць словамі, а вы будзеце расказваць верш рухамі.

*( кожны з вас – вавёрачка, паскакалі вавёрачкі)*

Скок вавёрка па сасне –

Паляцеў з галінак снег.

*(цяпер, кожны з вас— зайка, спіць зайка пад сасною)*

Пад сасною Зайка спаў –

Ён адразу белы стаў.

Верш расказваецца педагогам 3-4 разы.

## Тэма. Вясна

### Зносіны па тэме верша “Шпак”

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Пабуджаць выхаванцаў да выражэння сваіх ўяўленняў ў гукаперайманні песенькі шпака.

*Матэрыял:*малюнкі: шпак, шпакоўня.

Ход

- Вясной да нас прылятаюць шпакі *( паказваецца малюнак)*. Каб ім было дзе жыць людзі будуюць домікі, якія называюцца шпакоўні *( паказваецца малюнак)* .

-Паглядзіце, вось гэты домік, на малюнку. Калі ў шпака ёсць домік, у яго настрой цудоўны, ён спявае свае песні.

**Шпак**

Шпак вясёлы на шпакоўні,
У яго настрой цудоўны.
Не праспаў ён ранне,
Не праспаў сняданне.
Накарміў сваіх дзяцей,
Славіць сонца чыстае,
Тых, хто спіць за ўсіх пазней,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ён цяпер абсвіствае.

*Я. Крупенька*

- Давайце разам заспяваем вясёлую песеньку шпака.

- Фью, фью, фью.

- Паслухайце верш яшчэ раз.

- Пакажыце, як абсвіствае шпак тых, хто спіць за ўсіх пазней.

*Песенька шпака спяваецца з усімі дзеткамі, якія пажадаюць яе паўтарыць.*

## Тэма. Лета

### Зносіны па тэме верша " Ластаўка "

*Праграмны змест*: актывізаваць слоўнік дзіцяці па тэме "Птушкі", развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Пабуджаць выхаванцаў да выразнага дагаворвання асобных радкоў верша.

*Матэрыял:*малюнкі: ластаўка, шпак, верабей, варона, сарока.

Ход

- Пагдядзіце на гэтых птушак. Вось гэта ластаўка, шпак, верабей, варона, сарока. Пакажыце, дзе ластаўка.

- Назавіце гэтую птушку ( ластаўка).

- У ластаўкі чорная галоўка, чорнае пер'е, а цельца белае. Яна вельмі любіць цяпло і сонейка. Паслухайце, як пра гэта расказваецца ў вершыку.

**Ластаўка**

Ластаўка, куды?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-- На млынок,

Намялю там жыта

І спяку блінок.

Дзетак-малалетак

Накармлю;

Добра летам, добра летам,

Лета я люблю.

*А. Пысін*

- Давайце скажам разам з ластаўкай :

- Добра летам, добра летам,

Лета я люблю.

- Раскажам вершык яшчэ раз, я раскажу пра ластаўку , а ( Імя дзіцяці) раскажа як добра летам.

*Вершык расказваецца з усімі дзеткамі, якія пажадаюць яго расказаць.*

**Зносіны па тэме верша “Пчолка”**

*Праграмны змест***:** працягваць развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Вызваць у выхаванцаў жаданне суправаджаць расказванне верша адпаведнымі рухамі і гукаперайманнямі.

*Матэрыял***:**малюнак пчолка або цацка пчолка

Ход

- Гэта пчолка. ( малюнак або цацка). Яна лётае і спявае сваю песеньку: дж-дж-дж-дж

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Праспявайце песеньку пчолкі.

- Паслухайце вершык пра пчолку.

**Пчолка**

Пчолка цэлы дзень улетку
З кветкі лётала на кветку
Для таго, каб цэлы год
Нашы дзеці елі мёд.

*С. Сокалаў-Воюш*

- Я яшчэ раз раскажу пра пчолку, а вы пакажаце, як яна лётае з кветкі на кветку і спявае сваю песеньку.

Пчолка цэлы дзень улетку
З кветкі лётала на кветку.
Для таго, каб цэлы год
Нашы дзеці елі мёд.

*Педагог заахвочвае дзетак, каб яны лёталі пад словы верша і імітавалі гудзенне пчалы.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Зносіны па тэме верша Я. Крупенькі "Аленка"**

*Праграмны змест***:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту. Актывізаваць слоўнік выхаванцаў назвамі колераў вясёлкі.

*Матэрыял***:** малюнак вясёлкі, тонкія палоскі паперы на ўсе колеры вясёлкі.

Ход

- Прайшоў дожджык і на небе з’явілася вясёлка. Паглядзела на яе дзяўчынка Алёнка і залюбавалася. Якія прыгожыя колеры! Чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы*( паказаць малюнак вясёлкі)*.

- Паглядзіце і вы на колеры вясёлкі: чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы.

- Не сцярпела Алёнка і запыталася ў вясёлкі.

**Алёнка**

Запыталася Аленка

У вясёлкі залатой:

-- Хто табе купіў сукенку?

У мяне няма такой.

*А вясёлка ёй ў адказ*

-- З чыстых промняў, нібы з нітак,

Клапатліваю рукой

Летні дожджык мяне выткаў

З ясным сонцам раніцой.

*Я. Крупенька*

- Так, вясёлку выткаў летні дожджык з ясным сонцам.

- Паглядзіце, я назаву і пакажу вам колеры вясёлкі: чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы.

- Паслухайце верш яшчэ раз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- А цяпер я буду называць і паказваць вам колеры вясёлкі, а вы таксама будзеце іх паказваць.

**Зносіны па тэме верша В. Віткі “ Дожджык”**

*Праграмны змест*: развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Пабуджаць выхаванцаў да выразнага выканання асобных радкоў з верша.

*Матэрыял*:малюнак “ Лета”

Ход

- Сонейка высока ў небе, вельмі спякотна сёння на двары. Паклічам цёплы дожджык..

**Дожджык**

Ідзі, ідзі , дожджыку,
Звару табе боршчыку,
Пастаўлю пад лаўкаю,
Накрыю лапаткаю.
Пастаўлю пад елкаю,
Накрыю талеркаю.
Талерка не здымецца,
Дожджык не сунімецца.
Дожджыку нам трэба,
Каб было больш хлеба. *В. Вітка*

- Цяпер кожны з вас па-асобку пакліча дожджык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Юрасік, скажы : “Ідзі, ідзі , дожджыку”.

- А цяпер ты, Максімка: “Ідзі, ідзі , дожджыку”.

*Словы : “Ідзі, ідзі , дожджыку” гаворыць кожны, хто пажадае.*

- Я ізноў паклічу дожджык. Можа ён мяне пачуе і прыйдзе да нас.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ